■ Гасцёўня «Звязды»

«ВЕРА БЕЗ РОЗУМУ І РОЗУМ БЕЗ ВЕРЫ НЕМАГЧЫМЫЯ»

У Гомель філосаф і багаслоў Аляксандр Філоненка «заляцеў» на некалькі дзён па запрашэнні браціі Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра. Тут паспеў сустрэцца са студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны і епархіяльных біблейска-багаслоўскіх курсаў, паўдзельнічаў у праваслаўнай радыёпраграме «Ключ разумення» і пагутарыў аб актуальных праблемах праваслаўнай Царквы і грамадства з карэспандэнтам газеты «Звязда».

Аляксандр Сямёнавіч у свой час з поспехам скончыў фізіка-тэхнічны факультэт Харкаўскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «эксперыментальная ядзерная фізіка», але кандыдацкую дысертацыю абараніў па філасофскай антрапалогіі, а вядомасць набыў як багаслоў. І таму першае пытанне пра тое, чым быў матываваны пераход ад ядзернай фізікі да філасофіі і хрысціянскага багаслоўя?

— Вы ведаеце, тое, што часам здаецца парывам, скокам ад фізікі да філасофіі, ад філасофіі да багаслоўя, насамрэч пражываецца як бесперапынная, лагічна звязаная гісторыя, якую цяжка каментаваць... У дзяцінстве я адкрыў у сабе моцнае жаданне займацца фізікай і матэматыкай, потым, калі паступіў ва ўніверсітэт, вырашыў стаць прафесіяналам у гэтай справе. Але праз нейкі час з жахам зразумеў, што ў маіх навуковых занятках ужо няма той любові, няма таго здзіўлення і хвалявання, якія я адчуваў у школьныя гады. І вось гэты смутак пра страту стаў для мяне лёсавызначальным. Па розных прычынах, але я здагадаўся, што менавіта філасофія ёсць тая справа, якая дазваляе чалавеку вярнуць сабе першую любоў да свету. Яна дае нам здольнасць вечна здзіўляцца, задаваць пытанні, і значыць — быць жывымі! А з багаслоўем было яшчэ цікавей. У перыяд «перабудовы» раптам высветлілася, што існуе невядомы савецкім людзям свет — руская рэлігійная філасофія. Для мяне спачатку гэта было нязвыкла — даведацца, што ёсць строгая, сістэматычная, рацыянальная думка пра Бога. Але дзякуючы філосафам айцу Паўлу Фларэнскаму, Сямёну Людвігавічу Франку, часткова Мікалаю Бярдзяеву я, нарэшце, зразумеў, што супрацьпастаўленне веры і розуму — гэта каласальная памылка, звязаная з тым, што людзі вельмі вузка разумеюць розум і вельмі лжыва разумеюць веру. Насамрэч, калі разабрацца, вера без розуму і розум без веры немагчымыя!

— Вы з'яўляецеся вучнем вядомага мітрапаліта Антонія Суражскага (Блума). Многія людзі кажуць, што ўладыку, які памёр больш за 10 гадоў таму, сёння можна назваць святым чалавекам. Вы як лічыце?

— Відавочна, што дзякуючы сустрэчам з мітрапалітам Антоніем многія тысячы людзей набылі вопыт веры. Ён заўсёды казаў, што ніводзін чалавек на зямлі не можа сустрэць царства нябеснае, не сустрэўшы яго водбліска ў вачах іншага чалавека. Такім чалавекам для многіх і быў мітрапаліт Антоній. Вядома, пытанне кананізацыі — гэта пытанне царкоўнага сведчання і царкоўнага настаўніцтва. Я ўпэўнены, што ён быў выдатным сведкам Хрыста. Многія яго ведалі па тых візітах, якія ён ажыццяўляў, пачынаючы з 1962 года, у Савецкі Саюз. Ва ўмовах, калі пропаведзь была немагчымая, ён быў адзіным епіскапам, які мог свабодна гаварыць. І сустрэчы, якія тады адбываліся ў храмах, на кватэрах, у гатэлях ці проста на вуліцы, для многіх сталі лёсавызначальнымі. Я прыйшоў у царкву пазней, у канцы 80-х гадоў. Тады ўладыка Антоній казаў, што самыя складаныя гады, якія нас чакаюць — гэта гады, калі галоўным пытаннем стане — наколькі мы вартыя, здольныя быць адэкватнымі сведкамі таго подзвігу новапакутнікаў, які адбыўся ў нашай царкве ў XX стагоддзі.

Вядома, што ў Брытаніі ледзь не знікла валійская мова. І тады ў краіне разгарнулі праграму выратавання мовы, вялізную дзяржаўную адукацыйную падтрымку, у тым ліку абавязковае вывучэнне яе ў школе.

— А чым, на ваш погляд, вопыт новапакутнікаў — людзей, якія не страцілі веру, не адракліся ад Хрыста ў дастаткова цяжкіх умовах свайго жыцця, можа быць карысны сёння?

— Прыняцце вопыту новапакутнікаў для сучаснага верніка з'яўляецца вырашальным крытэрыем таго, наколькі жыццяздольная наша вера. За апошнія 25 гадоў Царква кананізавала 1700 новапакутнікаў. Гэта амаль у 6 разоў больш, чым да пачатку XX стагоддзя (316). Ёсць такая версія разумення абяцання Хрыста, які гаворыць: «Я ствару Царкву Маю, і вароты пекла не адолеюць яе». Сіла сведчання Хрыста такая, што нават у пекле мы бачым Яго святло. Я думаю, што менавіта такі вопыт здарыўся ў XX стагоддзі. Калі ўсім людзям на зямлі здавалася, што справа Царквы — толькі выжыць, яна змагла не толькі абараняцца, але і сведчыць у гэтых абставінах. І гэтае святло веры пранікала нават у такія куткі чалавечага існавання, якія складана ўявіць. І кожны новапакутнік ставіць перад намі пытанне: адкуль у яго бралася сіла такога сведчання? Наколькі мы здольныя ў мірныя часіны далучыцца да гэтага сведчання, наколькі наша жыццё можа быць тым святлом, якое пранікае ў пекла?

— Беларусаў сёння вельмі хвалюе тая сітуацыя, якая складаецца ва Украіне. Занадта мы блізкія, шмат у нас там сваякоў... Ці магчыма пераадолець супрацьстаянне, якое сёння адбываецца ў вашай краіне?

— У Царквы ёсць адна задача ў гэтым свеце — быць сведкамі таго міру, які прынёс Хрыстос. Людзі па слабасці сваёй мірам завуць стан пасля вайны, але гэта не мір. Гэта стан грамадства, якое думае па законах вайны. Магчыма, самае важнае і каштоўнае, што хрысціяне змаглі б у такім грамадстве, дзе ёсць падзеленасць і межы — прынесці мір, звязаны з малітвай і са сведчаннем пра Хрыста. І паказаць, што магчыма іншае жыццё. Украінскія падзеі можна вельмі парознаму ацэньваць, мне не хацелася б даваць палітычных ацэнак. Царква можа ва ўкраінскім грамадстве быць той сілай, якая забяспечвае міратворчую дзейнасць. Гэта важна для любога грамадства — каб прарастаў мір, пабудаваны не толькі на перамір'і, бяспецы і стабільнасці, але і пабудаваны па правілах дружбы і любові. І гэта заклік Царквы.

— З моманту распаду Саюза прайшло больш за 20 гадоў, за гэты час кожная краіна прайшла свой шлях. Як вы лічыце, магчымасці ўзаемадзеяння ў нас застаюцца?

— Калі паглядзець на гэту сітуацыю ў хрысціянскім кантэксце, трэба ўспомніць словы прападобнага Максіма-вызнаўцы пра тое, што Бог стварыў свет разнастайным. Але людзі па граху сваім адрозненне ператвараюць у падзел. Сапраўды, Бог не стварае аднастайнае і простае. Таму Ён увесь свет засяліў рознымі народамі — і гэта добра. Адрозненне — гэта Божае багацце і сведчанне багацця. Але людзі ўмеюць ператвараць гэтыя адрозненні ў падзел, і так нараджаецца зло. Для мяне багаццем з'яўляецца тое, што славянскі свет уяўляе такую разнастайнасць: культур, падыходаў, жыццёвых досведаў. Катастрофа, калі паміж гэтымі досведамі праводзяцца межы і яны супрацьпастаўляюцца адзін аднаму. Як хрысціяне мы можам супрацьпаставіць гэтай падзеленасці магчымасць стасункаў, шануючы адрознасць досведу, бачачы плён гэтых адрозненняў, гэтага шляху.

— Як праваслаўная Царква можа ставіцца да «досведу» разбурэння сямейных каштоўнасцяў у сучасным свеце?

— Відавочна, класічная сям'я разбураецца, але мы загадзя прайграем, калі будзем толькі папярэджваць грамадства аб наступствах яе страты. Ёсць куды больш плённы шлях. Важна паказаць свету прывабнасць і прыгажосць хрысціянскай сям'і. Хрысціянства прынесла ў інстытут сям'і пэўную евангельскую навізну, прывабнасць. І самі хрысціяне павінны адказваць, што для іх гэта навізна значыць.

Бог ствараў свет разнастайным. Але людзі па граху сваім адрозненне ператвараюць у падзел.

— Цікава ведаць вашу ацэнку такой з'явы, як знікненне мовы. Для нас, беларусаў, гэта вельмі актуальна.

— Мне здаецца, усяму свету зразумела, што мовы трэба выратоўваць. Больш за тое, ёсць дакладныя крытэрыі, па якіх зразумела, што мова знаходзіцца ў небяспечным становішчы і можа хутка знікнуць. Памяншаецца колькасць людзей, якія размаўляюць і пішуць на мове. Потым застаюцца людзі, якія не пішуць, але размаўляюць. А потым іх дзеці, якія разумеюць — але ўжо не размаўляюць. Працэнтныя суадносіны гэтых груп у пакаленнях лінгвістамі ацэньваюцца як сітуацыя небяспекі для мовы. Дарэчы, вядома, што ў Брытаніі ледзь не знікла валійская мова. І тады ў краіне разгарнулі праграму выратавання мовы, вялізную дзяржаўную адукацыйную падтрымку, у тым ліку абавязковае вывучэнне яе ў школе. І цяпер ёсць універсітэты, дзе выкладаюць на валійскай. Мова такім чынам была выведзена з крызіснага становішча і выратавана.

— Але ж многія лічаць, што не трэба нічога навязваць штучна, людзі самі разбяруцца, на якой мове даваць адукацыю дзецям...

— А тут як і з сям'ёй. Можна развіваць панічны настрой і лямантаваць: мы страчваем мову! Але гэта нікому не дапамагае. Адзіны спосаб захаваць мову — рабіць на ёй нешта такое, што стане прывабным для іншых. Калі культура жыццяздольная, зусім не важна, якога яна памеру. Гэта можа быць і тры, і сто, і тысяча носьбітаў. Культура павінна быць жывой і нараджаць шэдэўры. Людзі, якія любяць, ведаюць і цэняць мову, павінны самі сведчыць, што ў іх нацыянальнай культуры ёсць неверагодная прыгажосць — іх мова. І паказваць гэтую прыгажосць. Заўсёды знойдуцца людзі, якія будуць рабіць гэта па любові.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара

■

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Дацэнт кафедры тэорыі культуры і філасофіі навукі філасофскага факультэта Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя В.Н. Каразіна не абмяжоўваецца выкладаннем толькі ў сваёй установе. Ён друкуе артыкулы ў праваслаўных часопісах, з'яўляецца выкладчыкам Маскоўскага, Мінскага і Кіеўскага летніх багаслоўскіх інстытутаў, ладзіць агульныя праекты з італьянскімі праваслаўнымі вернікамі. Ён — лаўрэат прэміі фонду Джона Тэмплтана за курс лекцый «Навука і багаслоўе», удзельнічаў у даследчых праектах брытанскай акадэміі, галандскага Каталіцкага ўніверсітэта, чытаў лекцыі ў Біблейска-багаслоўскім інстытуце імя св. апостала Андрэя, на багаслоўскім факультэце Кембрыджскага ўніверсітэта, Інстытуце рэлігійных навук імя св. Фамы Аквінскага ў Кіеве...

КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ

Аб'яўлены рэспубліканскі конкурс для назначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2015 год

Указам Прэзідэнта заснаваны 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, што займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук. Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год у памеры, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам на падставе прапаноў спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.

Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай інавацыйнай дзейнасці. Пры гэтым дактары навук павінны быць ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдаты навук — да 35 гадоў, вучоныя без ступені — да 30 гадоў на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне.

Вылучаюць кандыдатуры арганізацыі па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага, на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе.

Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, прадстаўляюць па кожнай з іх хадайніцтва.

Дакументы прадстаўляюцца **да 1 ліпеня 2014 года** ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі; у Міністэрства адукацыі Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі вышэйшай адукацыі; у Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі.

Стыпендыі не назначаюцца маладым навукоўцам, якім у папярэднія пяць гадоў, уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне для ўдзелу ў конкурсе, прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам; тым, каму на год прызначэння стыпендыі прадстаўляюцца гранты ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 13 верасня 2013 года № 425; тым, каму на працягу трох гадоў, што папярэднічалі году прызначэння стыпендыі, прызначаліся іншыя стыпендыі Прэзідэнта, за выключэннем стыпендый і грантаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, таленавітай моладзі.

З поўнай інфармацыяй аб парадку правядзення конкурсу, умовах, устаноўленых для дасягнення таленавітых маладых вучоных, пералікам прадстаўляемых дакументаў можна азнаёміцца на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь **http://gknt.org.by**

Святлана БУСЬКО.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		418 989,6	375 568,8
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		9 448,8	15 233,3
4	Средства в Национальном банке	1103		2 249 525,0	1 578 785,3
5	Средства в банках	1104		1 122 280,2	783 008,2
6	Ценные бумаги	1105		1 665 696,3	821 848,9
7	Кредиты клиентам	1106		9 339 231,8	5 739 081,6
8	Производные финансовые активы	1107		847 562,8	703 342,5
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		147,6	147,6
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		489 993,5	336 724,1
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	228,5
12	Прочие активы	1111		146 767,0	101 942,4
13	**Итого активы**	**11**		**16 289 642,6**	**10 455 911,2**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		325 350,5	320 088,7
16	Средства банков	1202		3 968 089,8	1 479 737,8
17	Средства клиентов	1203		8 673 415,0	5 919 052,6
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		641 874,9	525 300,4
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206		124 323,9	219 121,0
21	Всего обязательства	120		13 733 054,1	8 463 300,5
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		1 252 268,8	1 252 268,8
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		280 901,9	231 235,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		217 975,3	176 490,4
27	Накопленная прибыль	1215		805 442,5	332 615,9
28	Всего капитал	121		2 556 588,5	1 992 610,7
29	**Итого обязательства и капитал**	**12**		**16 289 642,6**	**10 455 911,2**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		482 238,4	309 910,2
2	Процентные расходы	2012		246 299,5	144 301,6
3	*Чистые процентные доходы*	201		235 938,9	165 608,6
4	Комиссионные доходы	2021		97 803,2	67 458,5
5	Комиссионные расходы	2022		39 047,9	24 594,4
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		58 755,3	42 864,1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		630,2	123,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		3 956,3	22 298,5
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		3 563,1	12 702,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		22 267,8	42 613,6
11	Чистые отчисления в резервы	207		30 449,2	22 986,5
12	Прочие доходы	208		106 893,9	8 477,4
13	Операционные расходы	209		136 159,8	105 565,6
14	Прочие расходы	210		12 994,1	19 652,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		252 402,4	146 483,5
16	Налог на прибыль	212		36 158,0	22 560,0
17	**Прибыль (убыток)**	**2**		**216 244,4**	**123 923,5**

Председатель правления В.Д.Бабарико

Главный бухгалтер Т.М.Пивовар

Дата подписания: 4 апреля 2014 г.

Данная отчетность опубликова на сайте ОАО «Белгазпромбанк» **www.belgazprombank.by** в разделе «Финансовые показатели»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

■ Май на ўвазе!

НА ЧЫГУНАЧНЫЯ ПЕРАВОЗКІ ПАСАЖЫРАЎ — СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ТАРЫФЫ

Беларуская чыгунка і ААТ «Расійская чыгунка» ўводзяць спецыяльныя тарыфы на перавозку пасажыраў асобнымі цягнікамі ў зносінах Беларусь — Расія. Яны будуць дзейнічаць цягам сёлетняга года — з 1 чэрвеня. Мэтай новаўвядзення з'яўляецца павышэнне прыцягальнасці пасажырскіх перавозак.

У міжнародных пасажырскіх цягніках № 4/3 Брэст — Масква фарміравання Беларускай чыгункі і № 7/8 Масква — Брэст фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія» ў залежнасці ад тэрмінаў продажу да агульнага кошту праезду па тэрыторыі Расіі і Беларусі ў вагонах усіх тыпаў, за выключэннем агульных, будуць устанаўлівацца спецыяльныя тарыфныя ўмовы. 15-працэнтная зніжка да агульнага кошту праезду (білет на ўвесь маршрут следавання і плацкарта) — пры ўмове продажу праязных дакументаў у перыяд ад 60 да 31 сутак да адпраўлення цягніка. 10-працэнтная зніжка — пры ўмове продажу білетаў у перыяд ад 30 да 21 сутак да адпраўлення цягніка. Пры ўмове продажу праязных дакументаў у перыяд ад 20 да 11 сутак да адпраўлення цягніка зніжак не прадугледжана, а пры ўмове продажу праязных дакументаў за 10 сутак і менш да адпраўлення цягніка ўстанаўліваецца 5-працэнтная надбаўка да агульнага кошту праезду, патлумачылі ў прэс-службе магістралі.

Указаныя зніжкі і надбаўка не будуць дзейнічаць да кошту праезду на тэрыторыі Беларусі і кошту плацкарты ў вагоны фарміравання Беларускай чыгункі для наступных дат: 31.10 — 10.11; 25.12 — 31.12; па тэрыторыі Расіі і да кошту плацкарты ў вагоны фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія» для наступных дат: 31.10 — 04.11; 25.12 — 31.12.

Напрыклад, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 4/3 Брэст — Масква ў купэйным вагоне па маршруце Мінск — Масква складае 1 243 000 рублёў (па стане на 1 красавіка); у выпадку аплаты праезду да 31 сутак і больш да адпраўлення цягніка кошт праезду са зніжкай 15 працэнтаў складзе 1 058 000 рублёў.

Акрамя таго, устанаўліваецца зніжка ў памеры 10 працэнтаў ад агульнага кошту праезду пры адначасовым афармленні праязных дакументаў у напрамку туды-назад для праезду ў вагонах СВ і купэйных вагонах фарміравання Беларускай чыгункі № 96/95 (да 1 чэрвеня — № 196/195) Брэст — Масква і № 26/25 Мінск — Масква. Так, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 26/25 Мінск — Масква ў купэйным вагоне ў адным напрамку складзе 1 243 000 рублёў, а пры аплаце праезду туды-назад кошт праезду ў адным напрамку складзе 1 119 700 рублёў.

Пры гэтым вяртанне праязных дакументаў, афармленых па спецыяльным тарыфе для праезду туды-назад ажыццяўляецца пры адначасовым прад'яўленні двух праязных дакументаў, афармленых у абодва бакі. Вяртанне праязнога дакумента, не выкарыстанага ў адзін бок, а таксама частковае вяртанне праязных дакументаў, афармленых са зніжкай на праезд туды-назад, не праводзіцца.

У залежнасці ад размяшчэння месцаў павялічваецца розніца ў кошце праезду ў плацкартных вагонах цягнікоў № 4/3 Брэст — Масква; № 26/25 Мінск — Масква; № 96/95 Брэст — Масква фарміравання Беларускай чыгункі і цягніка № 7/8 Масква — Брэст фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія». Білеты на бакавыя паліцы плацкартных вагонаў названых цягнікоў будуць каштаваць менш. Напрыклад, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 26/25 Мінск — Масква ў плацкартным вагоне на не бакавых месцах складзе 674 700 рублёў, на бакавых месцах са зніжкай 10 працэнтаў — 608 300 рублёў.

Зніжкі, якія даюцца ў залежнасці ад размяшчэння месцаў у плацкартных вагонах, суміруюцца са зніжкамі ў залежнасці ад тэрмінаў продажу і зніжкай «туды-назад».

Указаныя тарыфныя ўмовы прымяняюцца пры праездзе ў міжнародных зносінах паміж Беларуссю і Расіяй і не дзейнічаюць пры афармленні праязных дакументаў у межах Беларусі, а таксама пры перавозцы арганізаваных груп пасажыраў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Акцыя

«НАША ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА»

Віцебск стаў адным з гарадоў, які сустракаў удзельнікаў міжнароднага аўтапрабегу «Наша Вялікая Перамога». Акцыя на колах прысвечана чарговай гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і юбілею вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Фота Аляксей СПАТКАЯ.

Каля дваццаці ўдзельнікаў аўтапрабегу на віцебскай плошчы Перамогі ўсклалі кветкі да Вечнага агню. Яны сустрэліся з кіраўніцтвам вертыкалі ўлады, прадстаўнікамі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, навучэнцамі.

— Мы вязём другі ў свеце па сваіх памерах аналаг Сцяга Перамогі, які ў 1945 годзе быў узняты над рэйхстагам. Плошча сцяга — 200 квадратных метраў. Вось ужо ў трэці раз ён перавозіцца па краінах былога СССР. Летась мы праехалі больш як 90 гарадоў Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Малдовы, Паўднёвай Асеціі. Сёлета на маршруце іх больш як 70, — паведаміў журналістам Алег Слюсарэнка, каардынатар праекта, крымскі журналіст.

Паводле яго слоў, стартаваў прабег у Севастопалі. Сярод іншых гарадоў на маршруце — Мінск, Орша, Магілёў, Смаленск, Мурманск, Масква. Фінішуе калона аўтамабілістаў напярэдадні свята Перамогі. Усе ахвотныя могуць далучыцца да калоны, каб частку маршруту праехаць разам. Гэта зрабілі і некаторыя жыхары Віцебска.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Спорт-тайм

«ДЫНАМА» ВЫЙШЛА НА ПЕРШАЕ МЕСЦА

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра другую запар буйную перамогу БАТЭ, рэванш хакейнай зборнай і поспехі беларускіх гімнастаў.

У «гараджан» так і не атрымалася паразіць вароты «бела-сініх».

Фота Тараса ШЧЫРАГА.

1. Пасля чацвёртага тура футбольнага чэмпіянату краіны вызначыўся аднаасобны лідар — мінскае «Дынама». Праўда, пераважна гэта залежала ад выніку матча «Нафтан» — «Шахцёр». Палачане і салігорцы згулялі ўнічыю 1:1 і прапусцілі наперад «бела-сініх», якія ў сталічным дэрбі перайгралі ФК «Мінск» — 2:0. З такім жа лікам скончылася і сустрэча жодзінскага «Тарпеда» з брэсцкім «Дынама». Тры ачкі на свой рахунак запісалі падапечныя Ігара Крывушэнкі. Упарты характар прадэманстраваў навічок вышэйшай лігі — «Слуцк», які з мінімальным лікам прайграў «Гомелю». У сярэдзіне другога тайма адзіны гол у матчы забіў Павел Сітко. Складаным атрымаўся паядынак паміж «Дняпром» і «Неманам» (2:3). На 86-й хвіліне вырашальны мяч у вароты магіляўчан забіў літоўскі навабранец «жоўта-зялёных» Эдгар Масцяніца.

Але самую буйную перамогу ў чацвёртым раўндзе атрымала БАТЭ. З лікам 5:2 «жоўта-сінія» перайгралі трыумфатара мінулага тыдня бабруйскую «Белшыну». У складзе барысаўчан дублем адзначыўся Міхаіл Гардзяйчук, які, дарэчы, яшчэ ў мінулым сезоне гуляў за бабруйскі клуб. Нягледзячы на ўнушальны вынік, галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр Ермаковіч знайшоў за што пакрытыкаваць сваіх падапечных: «Перамогай над добрым сапернікам задаволены. Рады, што вылучыліся нашы форварды. Але ёсць і мінусы: прапусцілі два галы, адзін з якіх — зноў са «стандарту». Ды і пасля выдалення перасталі гуляць. Такога быць не павінна. Усё-такі гуляем для балельшчыкаў, на хатнім стадыёне».

2. Зборная Беларусі па хакеі ўзяла рэванш у швейцарцаў за паражэнне ў першым таварыскім матчы. Пасля паражэння ў першым спарынгу з лікам 2:5 падапечныя Глена Хэнлана больш надзейна згулялі ў абароне. А ў серыі пасляматчавых булітаў сваё майстэрства прадэманстраваў самы вопытны галкіпер беларускай зборнай Андрэй Мезін, які адбіў усе тры шайбы. Перамогу ж нашай камандзе прынёс Аляксей Калюжны, які закінуў вырашальны буліт і зрабіў лік 2:1. Наступную серыю таварыскіх матчаў нацыянальная зборная правядзе 24 і 26 красавіка ў Даніі, а напярэдадні чэмпіянату свету згуляе з датчанамі на хатняй арэне.

3. З чатырма медалямі вяртаюцца ***беларускія гімнасты з этапа Кубка свету,*** які праходзіў у славенскай Любляне. У апорным скачку «золата» заваяваў Павел Булаўскі. У практыкаванні на брусах — «серабро» ў Анастасіі Якіменкі. І дзве «бронзы» на рахунку Васіля Міхаліцына (практыкаванне на кані) і Аляксандра Царэвіча (практыкаванне на перакладзіне). Адзначым, што гэты турнір стаў апошнім этапам падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы, які праз тры тыдні стартуе ў Сафіі.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■